Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.: гістарыяграфія, крыніцы

гістарыяграфія, крыніцы, сацыяльныя працэсы, буржуазія, пралетарыят, гандаль, індустрыяльнае грамадства, сацыяльна-эканамічнае развіццё, феадальныя адносіны, сельская гаспадарка

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.: гістарыяграфія, крыніцы [Тэкст]: справаздача аб НДР (закл.): / БДПУ; кір. Мацюш П.А., выкан. Люты А.М., Лютая А.Э. і інш.- Мн., 2020. - 100 с. - Бібліягр.: С. 88-100 (132 назв.). - № ДР 20160951.

**Аб’ект:** гістарыяграфія і крыніцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.
**Мэта**: сістэмны аналіз гістарыяграфіі, архіўных і апублікаваных дакументаў па гісторыі сацыяльна-эканамічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.
**Метады:** гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-генетычны.
**Вынікі:** ўдакладнена метадалогія даследавання сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў XVIII – XX ст. Створана класіфікацыя прадпрыемстваў па галінах прамысловасці. Вызначаны спецыфічныя рысы кожнай галіны прамысловасці, дзе знаходзяцца прадпрыемствы розных відаў. Параўнаны розныя тыпы прадпрыемстваў, а таксама прадпрыемствы аднаго тыпу ў розныя перыяды. Прааналізаваны сацыяльна-эканамічныя працэсы, выяўлена іх спецыфіка. Вывучана сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў названы перыяд на аснове аналізу ўзаемадзеяння яе структурных кампанентаў або падсістэм: дробнатаварнай, мануфактурных, фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў. Паказаны змены, як галіновай структуры, так і тэрытарыяльнага размеркавання эканамічных аб’ектаў, якія адбываліся ва ўзаемасувязі з іншымі сферамі грамадскага жыцця: сельскай гаспадаркай, развіццём гарадоў, транспартнай інфраструктурай, фінансава-банкаўскай сістэмай з канца XVIII да пачатку XX ст .
**Ступень укаранення**. Павышэнне якасці выкладання курсаў гістарыяграфіі і крыніцазнаўства ў ВНУ і ў цэлым аптымізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі рэспублікі.
**Галіна выкарыстання.** Падрыхтоўка абагульняючых прац па гісторыі Беларусі.